Газета дзяржаўнай установы адукацыі
"Грычынскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад –базавая школа"



# Перапынак!



№8
Красавік, 2021

Школа - гэта родны дом,
Дружна тут усе жывём,
Пра падзеі ў школьным свеце
Мы раскажам у газеце!

## Чытайце ў нумары:

Такія карысныя канікулы стр. 2

Усе не суботнік!!! стар. 3

Спрорт і здароўе стар. 4

Прафілактыка правапарушэнняў стар.5

Весткі з дзіцячага сада стар. 6



# Такія карысныя канікулы




Канікулы - тыднёвы аазіс адпачынку сярод школьных будняў. Гэты адрэзак павінен быць максімальна яркім і насычаным, каб паспець зарадзіцца пазітыўнымі эмоцыямі перад вучобай і адкрыць для сябе нешта новае і цікавае. Усё гэта можна было знайсці ў аздараўленчым лагеры “Сонейка” і вялікай колькасці разнастайных мерапрыемстваў, якія былі падрыхтаваны для ўсіх жадаючых: экскурсіі, конкурсы, віктарыны і г.д.













# Усе на суботнік

Вясна… Гэта не толькі час калі прырода ажывае пасля доўгага зімовага сну, але і час навядзення парадку і чысціні. У нашай школе стала добрай традыцыяй праводзіць веснавыя суботнікі. Таму красавік – гэта перыяд навядзеня парадку у двары, у аграгарадку, ля помнікаў, на Зямлі.

У суботніку прынялі ўдзел як супрацоўнікі, так і навучэнцы ўстановы. Сумесная праца - гэта выдатная магчымасць зрабіць наш калектыў-настаўнікаў і навучэнцаў, больш згуртаваным і дружным.

Кожны знайшоў сабе справу па сіле і густу.







# Спорт і здароўе

Здароўе, спорт, здаровылад  жыцця — што гэтыя словы значаць для сучаснага чалавека? Здароўе – гэта галоўнае багацце, якое даецца чалавеку. Таму неабходна прыкласці ўсе намаганні для тако каб яго не толькі зберагчы, але і памножыць.

Здаровы лад жыцця не магчымы без руху. А рух – гэта спорт, гэта каменьчык у пераміду здароўя. Таму ў нашай установе вялікая ўвага надаецца спартыўным мерапрыемствам, у якіх удзельнічаюць і навучэнцы, і педагогі, і бацькі.



**Здаровае жыццё чакае тых, хто актыўна і рэгулярна займаецца спортам.**









# Прафілактыка правапарушэнняў

Чаму людзі здзяйсняюць правапарушэнні? Кожны чалавек здольны зрабіць свой выбар у жыцці: ці ісьці сумленным шляхам, зарабляючы неабходныя грошы, адмаўляючы сабе ў шматлікіх задавальненнях і жаданнях, або ступіць на шлях злачынства ў пошуках лёгкай нажывы. Усім вядома, што красці, біцца, парушаць правілы дарожнага руху - дрэнна. На жаль, не кожны падлетак, ўсведамляе, што яго супрацьпраўныя дзеянні, вядуць да цяжкіх і непапраўнах наступстваў.

Гутаркі, круглыя сталы, класныя гадзіны аб адказнасці непаўналетніх за свае ўчынкі, а таксама сустрэчы з супрацоўнікамі АДАІ Дзяржынскага РАУС дапамогуць нашым навучэнцам стаць законапаслухмянымі грамадзянамі сваёй краіны.




Любы чалавек, і сталы, і малады, і падлетак павінен быць адказным за сябе, за свае словы, за свае дзеянні.







# Весткі з дзіцячага сада



У другім месяцы вясны нам таксама не было часу сумаваць. Мы святкавалі народныя святы, удзельнічалі ў конкурсе “Таленты новага пакалення”, віншавалі сваіх сяброў і весела гулялі.







